Год 1. Нядзеля, 25 сьнежня (12 дзекабра) 1921 г. № 16

# БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак.

## Часовая Урадавая Камісія Віленскага Саюзу Каапэратываў.

Склікае на 28 сьнежня (дзекабра) г. г. аб 11 гадзіне раніцы надзвычайнае вальнае сабраньне паўнамоцнікаў у будынку Польскага Работніцкага Дому (вул. Жэлігоўскага 4) з гэткім парадкам дня: 1) выбары прэзыдыуму зьезда, 2) выбары Мандатнай і інш. Камісій; 3) справаздача Рэвізыйнай Камісіі; 4) справаздача Рады; 5) справаздача быўшага ўраду; 6) справаздача Часовай Урадавай Камісіі аб цяперашнім палажэньні Саюза; 7) плян будучай дзеяльнасьці і арганізацыя Саюзу; 8) выбары Ураду і іншых органаў Саюзу; 9) вольныя пытаньні.

Калі-б 28 сьнежня не зьявіўся адпаведны па Статуту Саюза лік паўнамоцнікаў, чарoднае вальнае сабраньне склікаецца там-жа 29 сьнежня аб 11 гадзіне раніцы і яно будзе лічыцца правамоцным пры абы-якой колькасьці прыбыўшых на сабраньне паўнамоцнікаў.

Часовая Урадавая Камісія Вілен. Саюз. Каапэрат.

### Беларускае пытаньне на Вашынгтонскай канфэрэнцыі.

ГДАНСК, 14 сьнежня 1921 г. (Славбюро). Урад Беларускай Народнай Рэспублікі падаў Вашынгтонскай канфэрэнцыі мэморандум з просьбаю зьвярнуць увагу на долю беларускага народа. У мэморандуме зьмешчаны пратэст супроць тэрору палякоў па Беларусі. Мэмарадум пратэстуе таксама супроць распрадаваньня Польшчаю лясного багацьця Беларусі.

### Як зьезд арганізацыі „Краевая Сувязь" зьняважыу Сымона Рак-Міхайлоускага.

Аляксюкоўскі зьезд у рэзалюцыі па школьнаму пытаньню пастанавіў:

„Запрасіць Кіраўнікам Асьвятовага аддзелу пры Камітэце Краёвай Сувязі вядомага практычнага пэдагога і школьнага дзеяча Сымона Рак-Міхайлоўскага".

Тады, каб не дапусьціць абдурываньня беларускіх сялян імем, якому яны вераць, С. Рак-Міхайлоўскі напісаў у рэдакцыю „Беларускага Звону" пісьмо, у якім меж іншым кажа:

„Я уважаю, што ўспомнены „зьезд" быў палітычнай дэмонстрацыяй людзей, якія здраду беларускай справы хочуць замаскаваць рэзалюцыямі аб асьвеце, аб зямельнай справе і г. д. і гэтым засьляпіць вочы маласьвядомым масам. Дзеля гэтага ня можа быць жаднай гутаркі аб тым, каб я згадзіўся прыняць становішча, на якое мяне выбраў той зьезд, з якога нанятыя асобы выкідалі і білі маіх палітычных сяброў і не дапусьцілі мяне да зьвезеных на „зьезд" людзей".

*Сымон Рак-Міхайлоускі.*

18. XII. 21 г.

### Самазванцы працуюць...

Нацыяналістычная польскія газэты б'юць у звоны, што прадстаўнікі Заходняй Беларусі прыехалі ў Варшаву і былі ў Начальніка Польшчы п. Пілсудзкага, у старшыны міністраў Панікоўскага і ў іншых важных асоб, якім заявілі, што сяляне Заходняй Беларусі стаяць на грунце польскай дзяржаўнасьці і хочуць, каб Заходняя Беларусь была далучана да Польшчы.

Аказуецца, што пад відам прадстаўнікоў Заходняй Беларусі робяць сваю справу дэлегаты ад быўшага ў Вільні зьезда арганізацыі „Краёвая Сувязь" (нешта падобнае да знанае „Стражы Крэсовай").

Вядомага апавешчаньня Беларускага Нацыянальнага Камітэту аб запраўдных адносінах беларусаў да „Краёвай Сувязі" тыя газэты, разумеецца, ня друкуюць.

## Што чуваць у сьвеце?

### Справы Ірляндыі.

Вядомы правадыр ірляндцаў Дэ-Валера заявіў, што калі ратыфікуецца англа-ірдляндзкі дагавор, дык ён адойдзе ад палітычнага жыцьця.

### Нямеччына ня мае грошы на кантрыбуцыю.

Нямецкі ўрад паведаміў камісію па кантрыбуцыі, што можа заплаціць толькі часьць платы за студзень у суме 500 мільёнаў марак золатам. На рэшту Нямеччына просіць пачакаць.

### Англія і Расея.

Ангельскія газэты паведамляюць, што Лёйд-Джордж мае замеры правесьці праз парлямэнт прызнаньне савецкага ўраду ў Расеі. У тыя самыя часы разважацца будзе пытаньне аб супрацоўніцтве Англіі і Нямеччыны пры адбудаванані Расеі.

### Нарада Лёйд-Джорджа з Красіным.

Раніцай 16. XII адбылася доўгая нарада Лёйд-Джорджа з Красіным у прысутнасьці міністра фінансаў Горна.

### Аўстра-угорская спрэчка.

Аўстрыйскі ўрад прыслаў плебісцытнай камісіі ў Шопроні ноту, паведамляючы, што Аўстрыя ня прызнае рэзультатаў плебісцыту, які прайшоў, як вядома, на карысьць Угоршчыны (Вэнгры).

### Грэка-Турэцкая вайна.

Як паведамляюць з Ангоры, туркі афіцыяльна 15. XII. абвяшчаюць, што грэкі значнымі сіламі атакавалі іх, але адыйшлі пасьля бою з вялікімі стратамі.

### Фінляндыя гандлюе з Расеяй.

Фінляндыя пачала моцны гандаль з Расеяй, пасылаючы туды паперу і папяровую масу.

### Салдацкая служба ў Польшчы.

Польскі сойм прыняў закон аб ваеннай службе. Чынная служба будзе цягнуцца два гады, запас да 40 гадоў; прызыўны век у ваенны час 21 год, а ў спакойны—19 гадоў.

### Сьмерць польскае пісьменніцы.

ЛЬВОЎ 19. XII. (А. В.) Памёрла вядомая пісьменьніца Габрыэля Запольская.

### Амэрыканскае консульства ў Коўні.

У Коўні адчыняецца амэрыканскі консулят.

### Новая рэвалюцыя.

У Партугаліі ізноў рэвалюцыя (невядомага пакуль што кірунку). Міністры паўцякалі.

### Пратэст літоўскага ўраду.

З Коўні паведамляюць, што на апошнім паседжаньні сойма прадстаўнік ураду выступіў з пратэстам супроць выбараў у Віленшчыне.

## Каапэрацыя за 1921 год

Разьвіцьцё каапэрацыі надта шыбка пасунулася за час вайны, а цяпер ідзе і далей. Недахваткі таго ці іншага, пасьля ўсясьветнай вайны, змушаюць людзей лучыцца ў каапэрацыю, каб супольна змагацца з гэтымі недахваткамі. Цяпер за ўсім сьвеце мала гдзе знойдзецца такі куток, гдзе-б ня ведалі, што такое каапэрацыя, а усяго толькі 76 гадоў, як ў Англіі быў адчынены першы каапэратыў. Але чым больш расьце, крэпне каапэрацыя, тым больш бяды на яе сыплюцца са ўсіх бакоў: змаганьне з клясамі багатыроў і гандляроў, якім не падабаюцца ідэі каапэрацыі; змаганне з умешваньнем урадовай улады ў каапэрацыю, як у вольнае злучэньне людзей, якія ўсімі сіламі хочуць нармаваць жыцьцё і разьвіцьцё каапэрацыі; змаганьне з уплывамі на каапэрацыю шавіністычных груп, якія хочуць зрабіць з капэрацыі (па сваей прыродзе інтэрнацыянальнай) гнёзды нацыяналізму.

У гэтым годзе адбыўся Усясьветны Каапэратыўны Кангрэс, які прыняў шмат рашэньняў у справе павялічаньня каапэратыўнага разьвіцьця. Меж іншым, змагаючыся з уплывамі шавінізма у каапэрацыі, гэты Кангрэс прыняў адну рэзалюцыю ў справе ўціску акраіннай каапэрацыі ў Польшчы, вынесеную па жальбе украінцаў, а цікавую і для Беларусі, якая знаходзілася і знаходзіцца ня ў лепшых варунках, чым Галіцыя. Гэта рэзалюцыя гласіць: „Кангрэс выказуе жаль з прычыны перасьледаваньняў украінскіх каапэратываў у Усходняй Галіцыі польскімі вайсковымі уладамі і спадзяецца, што перасьледаваньні гэтыя спыняцца, а каапэратывам пакінена будзе свабода разьвіцьця".

Каапэрацыя ў суседніх з намі народаў: Польшчы, Літве, Латвіі, Маскоўшчыне ўсюды дужа шыбка пашырылася, але на жаль у Польшчы яна разьядаецца шавінізмам. Сойм выдае закон за законам, апякаючы каапэрацыю, а запраўды толькі перашкаджаючы разьвіцьцю каапэрацыі. „Ня-польская" каапэрацыя ўціскаецца і вайсковымі і цывільнымі ўладамі. Вядзецца змаганьне з каапэрацыяй і на Валыні і ў Галіцыі, адкуль да нас даходзяць жальбы каапэратараў. У Літве каапэрацыя разьвіваецца таксама даволі шырока, але, на жаль, яна дужа мала—ідэйна, а знаходзіцца на паваду ў ураду і часта замяняе сабою інтэнданцтва. Трэба спадзявацца што гэткае зьявішча ў Літве часовае, і каапэрацыя літоўская неўзабаве выйдзе з-пад апекі. У Латвіі справа стаіць значна горш. Там мы спатыкаем каапэратывы, якія сорам сказаць займаюцца гандлем гарэлкай. Разьвіцьце каапэрацыі ў Латвіі яшчэ ня дужа моцнае і з ідэйнага боку можна-б было жадаць многа лепшага. Аб Маскоўшчыне пакуль што нечага і гаварыць. Дужа моцная расейская каапэрацыя цяпер захоплена бальшавікамі і на вывесках яе красуюцца літары „Р. С. Ф. С. Р."—гэта значыцца, што каапэрацыя у Маскоўшчыне страціла вольнасьць і незалежнасьць ад ураду і стала урадовай каапэрацыяй.

Цяпер зьвернемся да каапэрацыі нашага краю. Дужа яшчэ маладая, пачаўшыся ад 1917 году (рэдка гдзе раней) яна перажывала разруху ўсясьветнай вайны, а пасьле вайны польска-бальшавіцкай. Каапэратывы цярпелі ад той і ад другой арміяў, але паўставалі ўзноў.

У краі істнуе краёвы Саюз Каапэратываў, які называецца „Віленскі Саюз Каапэратываў". Ен злучае каля сябе болі як 200 каапэратываў. Штучна створаныя шавіністамі і польскімі палітыкамі Саюзы; „Цэнтраля Таварыстваў Рольніча-Гандлёвых"—арганізацыю Стражы Крэсовай і „Саюз Земі Віленскай"—які працуе над стварэньнем „польскай" каапэрацыі на урадовыя пазычкі, мы тут лічыць нь будзем. Гэты наплыў у нашым краі рана ці позна будзе зьнесены і ў краі застанецца незалежная каапэрацыя. Прашоўшы год быў годам значнага разьвіцьця каапэрацыі. На вёсках паўставалі новыя і новыя каапэратывы, і хоць людзі бывалі незадаволены працай яшчэ ня вопытных каапэратываў, але нігдзе не здаралася чуць, што каапэратыў непатрэбен, бо ўсякі зразумеў выгаду ад яго. Разьвіцьцю каапэрацыі дужа заміналі урадовыя ўстановы і Літвы Сьродковай і Польшчы; так напрыклад: пад рознымі прычынамі каапэратывы не рэгістраваліся у Староствах ці рэгістрацыя надоўга затрымлівалася, часта не рэгістраваліся статуты, пададзеныя на дзьвюх мовах—польскай і беларускай. У Літве Сьродковай ураднікі розных дэпартамэнтаў прытрымліваліся цры рэгістрацыі закона аб каапэрацыі, прынятага Варшаўскім Соймам, хоць гэты закон на нас не пашыраны. Віленскі Саюз Каапэратываў заўсёды быў пад асобай апекай: урадніка Дэпартамэнту Скарбу вельмі не далікатна ўваходзілі ў памяшканьне Саюзу, паказывалі сябе хворымі на гістэрыю, забіралі кнігі, і цяпер яшчэ Урад Літвы Сьродковай трымае ў сябе ўсе бугальтэрскія кнігі Саюзу і за 1920 і за 1921 год, усё чагось у іх шукаючы... Інструктары Саюзу арыштовываліся, сам Саюз прызнаны Дэпартамэнтам Скарбу за „не каапэратыўную" арганізацыю і абложаны падаткам у 1.120.000 ад прыбылі, якой саўсім у 1920 г. ня было. У канцы канцоў Саюз „злавілі" знайшлі „зладзейства"... Бачыце: залажыў цукер, але ня выкупіў у пару, і тутака пачалі траўлю процїў краёвай арганізацыі...

1921 год у нашым краі прайшоў з вялікім змаганьнем нашай краёвай каапэрацыі з тым, хто ў нашу каапэрацыю хацеў занясьці палітыку і нацыяналізм. Перасьледаваньне „ня польскіх" каапэратываў было лёзунгам. Літоўскі каапэратыў „Ляймэ" зачынены толькі за тое, што прадставіў статут на адной літоўскай мове.

Цяжка незалежнай каапэрацыі разьвівацца ў нашым краі! Але трэба спадзявацца, што саўсім задушана яна ня будзе, што зьменяцца варункі жыцьця ў нашым краі, што самі палякі уцямяць усю шкоду той працы, якая вялася імі ў адносінах да каапэрацыі у мінулым годзе, і дадуць магчымасьць вольнага разьвіцьця каапэрацыі. А вызвалёная з пад апекі ўладаю,—каапэрацыя шыбка расьцьвіце.

*Каапэратар.*

*Хто ня прыслау яшчэ падпісных грошы за сьнежань (дзекабар), таго просім не пазьніцца каб ня было задзержкі у высылцы газэты.*

## Паведамленьне.

Прафэсыянальны саюз рабочых безьзямельных і малазямельных Сярэдняй Літвы склікае на 26 сьнежня зьезд у Вільні прадстаўнікоў безьзямяльных і малазямельных сялян Сярэднай Літвы.

Кожная вёска і маёнтак мае права паслаць па два прадстаўнікі, а калоніі Ізраільскіх рабочых і фальваркі па аднаму. Прадстаўнікі павінны мець з сабою адпісы пратаколаў і ежы на два дні. Зьяўляцца павінны загадзя у канцэлярыю Саюза (Вільня. Віленская вул. № 12). На зьездзе будуць разглядацца гэткія пытаньні: 1) Справаздача кіраўніцтва саюза. 2) Выбары цэнтральнага бюро. 3) Бягучыя справы.

*Кіраўніцтва Саюза.*

## АБВЕСТКА.

Гэтым даводзіцца да агульнага ведама грамадзянства, што ў горадзе НЯСЬВІЖЫ аднавіла свае заняткі пераходная Беларуска-расейская 8-клясавая жаноцкая гімназія Жаўнаркевіча.

У I і II клясах навукі выкладаюцца ў беларускай мове, а ў III—VIII кл. кл. — у расейскай.

Кіраўнік Гімназіі СЧАНСНОВІЧ.

Г. Нясьвіж,
12—XII—1921 г.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзе больш падпісчыкаў, газэта стане на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісываццa, бо ад гэтага залежыць далейшае жыцьцё «Беларускіх Ведамасьцей». Хто ня ўмее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы, Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і сацыяльных ворагаў і працуе над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Браты, прыміце блізка да сэрца ўсе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб «Беларускія Ведамасьці» ў вашым раёне выпісываліcь і пашыраліcь.

Хай жывець народная справа!

Адрэс: Wilno, Ostrobramska № 9, „Беларускія Ведамасьці".

### „БЕЛАРУСКІМ ВЕДАМАСЬЦЯМ"

патрэбны прадстаўнікі і карэспандэнты ўва ўсіх старонках сьвета.

# Беларускі Нацыянальны Камітэт, заявіў, што пры цяперашніх варунках выбіраць

## Савецкая Беларусь і Савецкая Расея.

(Па ведамасьцях менскіх газэт).

### Грашовыя і харчовыя ўзаемаадносіны.

„Пытаньні правідловых узаемаадносін між Савецкімі Рэспублікамі, уваходзячымі ў фэдарацыю, маюць вялікае значэньне, асабліва ў адносінах грашовых і харчовачных. Гэтыя пытаньні ў апошні час былі пытаньнямі асаблівай увагі і інтарэсу з боку кіраўнічых устаноў Савецкай Беларусі і Р. С. Ф. С. Р.

Для канчатковага ўрэгуляваньня ўзаемаадносін, у Маскву надоечы езьдзіла дэлегацыя ў складзе Чарвякова, Вайнштэйна і Ходаша. Прыдаючы вялікае значэньне дасягнутым дэлегацыяй вынікам, супрацоўнік Белросты зьвярнуўся да старшыні Савету Народных Камісараў Чарвякова за атрыманьнем належных інфармацыяў.

### Мэты і задачы дэлегацыі.

Наша дэлегацыя—заявіў Чарвякоў—паставіла ўперад усяго пытаньне аб выяўленьні абавязкаў Беларусі ў сэнсе здачы часткі сабраных па харчовай падатку сельска-гаспадарчых харчоў Беларусі, пасьля здаволеньня мясцовых патрэб, у агульна-фэдэратыўны кацёл. Далейшым пытаньнем было здаволеньне Беларусі патрэбным лікам грошаў, неабходных для правідловага вядзеньня будаўніцтва ў Беларусі.

Гэтыя пытаньні абгаварываліся прэзыдыумам У. Ц. В. К. і СТО, якія ўперад усяго зазначалі, што Народны Камісарыят Харчаваньня Р. С. Ф. С. Р. павінен у сваіх адносінах да Народн. Камісарыяту Харчаваньня Беларусі кіравацца запраўдным сэнсам саюзнай умовы, па якой гэтыя камісарыяты зьяўляюцца неаб'яднанымі.

У Беларусі застаўляецца для здаволеньня мясцовых патрэб (апрача пракармленьня войска і чыгуначнікаў) 60.000 пудоў хлебных харчоў штомесячна. Рэшта харчоў у зьвязку з цяжкім харчовым становішчам Савецкай Расеі, выкліканы голадам у Паволжы, перадаецца Нар. Кам. Харчаваньня Р. С. Ф. С. Р., і расходуецца пя нарадах апошняга.

Што тычыцца грашовага становішча Беларусі, цык будзе заснован парадак, па якому Камісарыяты Беларусі забясьпечаюцца не па ведамасьцях, а са спэцыяльнага грашовага фонду, атрымліваемага Саветам Народных Камісараў Беларусі ад Р. С. Ф. С. Р. праз Народны Камісар. Грашовых Спраў.

Гэткая сыстэма забясьпечыць правіцельству Беларусі магчымасьць заснаваць моцны бюджэт з мэтай нармальнай і правідловай працы савецкіх і гаспадарчых устаноў.

Гэты кірунак дасьць магчымасьць заснаваць для рабочых і служачых дзяржаўных устаноў цьвёрдыя стаўкі, запясьпечваючыя найменшую патрэбу для пражыцьця.

Гэтым цьвёрдым грашовым і харчовым фондам Савет Народн. Камісараў Беларусі зможа кіраваць зусім самасьційна па свайму пагляду.

### Зьменшэньне ліку служачых.

Зроблены тэрміновыя крокі да зьменшэньня ліку служачых, галоўным чынам, у савецкіх установах, і застаўленьня толькі запраўдна патрэбных працаўнікоў. Гэтыя меры зьменшаць канцалярскую цеганіну і падыймуць вырабнасьць працы дадуць гэтак сама магчымасьць лепш забясьпечыць застаўшыхся на службе працаўнікоў.

### Краёвы дзяржаўны банк.

Намі ўжо атрымана шмат заяў, як ад дзяржаўных устаноў і прадпрыёмстваў, гэтак і ад каапэратыўных арганізацыяў і прыватных прадпрыёмстваў аб выдачы розных пазык і інш., што ня можа быць выканана без дапамогі банку.

Падгатоўная праца па арганізацыі банку ўжо зроблена, маецца склад праўленьня банку, вядуцца перамаўленьні з праўленьнем дзяржаўнага банку.

Можна думаць, што ў сьнежні банк пачне ўжо працу".

## З жыцьця й пісьменства.

За бягучы год у віленскай беларускай прэсе зьявілася й пасьпела з большага сябе выявіць некалькі новых літэрацкіх імяў.

З іх часьцей спатыкалася й найбольш зьвярнула вагі імя Натальлі Арсеньневай.

Вершы яе вельмі лірычныя, сардэчныя. Яны чаруюць нас сьвежасьцю, праўдзівасьцю натхненьня.

Н. Арсеньнева знае мінюты творчасьці, мінюты, „калі душа гарыць, расьце".

Зьмест яе паэзіі — ці асабістыя пераживаньні, ці малюнкі з прыроды. Настроі яе элегічныя, засмучоныя.

Наагул трэба адзначыць, як характэрную рысу, што ў паэзіі п. Арсеньневай мала сустракаецца сацыяльных элемэнтаў. Мы гатовы гэта тлумачыць як змогу ад сучасных надзей і натуральную супроць іх рэакцыю. Пясьнярка хоча забыцца, ня думаць „аб тым няпрыхільным, нямілым, сумным жыцьні астатніх гадоў".

Арсеньнева асабліва любіць прыроду, любіць „песьні ветра ў полі"; яе „завець сіняе неба", вабіць „вольны прастор".

Але прырода ў яе не мінэральная, не „раўнадушная" а жывая, поўная таёмных сілаў. Таму зоры ў яе „бачуць", неба „будзіць зямлю ад доўгага сна", вясна йдзе „княгіняю".

Вельмі прыметна для творчасьці Н Арсеньневай баляда „Балотніца". Тут мы бачым спробы падыйсьці да народнай творчасьці (прычытаньні балотніцы). Нам вельмі падабаюцца такія звароты:

„Не сьпякло мяне ясна сонейка, Не зламаў віхор у васеньню ноч, — Загубіў мяне чарнабрывы мой"

Ці вось: Не ў царкве з папом панахвіда йшла, Матка плакала над дачушкаю"...

Цікавым ёсьць так сама жаданьне выявіць фізычна аблічча балотніцы.

Гэтая самая тэндэнцыя відаць і ў вершы „Лясун". Асоба лясуна выяўлена рэльефна, але нажаль ён мала нацыяналён (? — Рэд.).

З папярэдніх песьняроў толькі ў Максіма Багдановіча спатыкаем спробу ў гэтым кірунку (Вадзянік).

Шкада толькі, што вершам Арсеньневай шкодзіць часам слабая апрацоўка. Пясьнярка мала працуе над шліфоўкаю верша, таму поруч з запраўды добрымі рэчамі, як „Красавік", сустрачаем даволі цяжкія, як напр. „Сьняжынкі".

Ці ў вершы „Вясна" „такое месца:" Маленькія яблынак рожкі (?)

Нібы рвуцца да сонца лучоў"

Няўжо не знайшлося іншай рыфмы да слова „дарожкі", апрача „рожкі"?

Нямножна рыфмаваць таксама „рукі—мукай".

Шкодзіць вершам тое, што рыфма не заўсёды вытрымана.

Кідаецца ў вочы беларускі слоўнік, якім валадае пясьнярка. Да прыкрасьці часта сустрачаюцца словы „галубы" „празрысты".

Досыць часта спатыкаюцца й маскалізмы: лучы, давяць, на рукі, прабудзісь, чуюцца й полёнізмы: бляск і інш..

Нядобра гучаць скарочаныя дзеясловныя формы на „ся", ды асабліва, калі яны рыфмуюцца. А такія выпадкі ў вершах Н. Арсеньневай бываюць:

„забылісь — заіскрылісь",
„загарэлісь — глядзелісь",
„сьнялісь — прабудзісь",
„круцицесь — прытуліцесь",
„схілілісь — зьбілісь",

і многа іншых.

Падобныя дзеясловныя формы не прызвычаены беларускай мове й іх трэба высьцярагацца. Стараюцца ня ўжываць іх Янка Купала, Бядуля і інш.

Але ўсе гэтыя заганы дробныя й пры большай уважнасьці й вымаганьні ад сябе іх лёгка мінуць.

Н. Арсеньнева яшчэ толькі пачынае, яна маладая й здольная, талент яе заметна буяе, толькі сур'ёзней і стражэй трэба адносіцца да сваіх твораў, толькі больш вымагаць ад сябе, і мы пабачым многа-многа каштоўных і запраўды мастацкіх рэчаў нашай пясьняркі.

Вал. Жыл.

## Расейцы аб беларусах

(Бібліяграфічны нарыс)

Расейская палітычная думка розных кірункаў —усё болей і болей пачынае цікавіцца беларускай справай.

Ня кажучы ўжо аб расейскіх газэтах, якія—і ў Амэрыцы, і ў Эўропе, і ў Азіі—што дня зьмяшчаюць цэлыя шпальты з надробным высьвятленьнем становішча Беларусі пад акупацыямі, —

Гальяш Леўчык.

### Дажынкі на Беларусі ў 1920 г.

...Вось так жнеі, вось так жніва!
„Збожжа" шэра, чорна, сіва....
Гэта-ж людзі ў кроўнай лужы,—
Серп пажаў іх гостры, дужы.
Ня ў гумне ім—ў гробе быці,
Чэрві будуць малаціці..
Іх зярнят люд не пазнае,
Ўсе „снапэ" пясок зраўняе...

Вось так жніва, вось дажынкі!
Дзе-ж сялянскія будынкі?
Гаспадар дзе з гаспадыняй,
Што ўладалі поўнай скрыняй?
Дзе-ж валэ, вазэ і снасьці,
Каб снапэ ў гумно пакласьці?..
— Ніц нямаш—вайна, гарматы
Зжалі ўсё—людзей і хаты....

Янка Быліна.

### Трыолет.

Ты будзь, брат, цьвёрды, як скала,
Хоць гора над табой сарвецца:
Пад ім мо' воля скалыхнецца,
Ты будзь, брат, цьвёрды, як скала,
І вер, што бура пранясецца,—
Хоць шмат каго яна змагла.
Ты будзь, брат, цьвёрды, як скала,
Хоць гора над табой сарвецца.

Валадзімір Жылка.

### Незразумелае.

О, какъ убійственно мы любимъ...
Ф. Тютчевъ.

Як малою хапала ты сьвет,
І казала з трывогаю маці:
„Гэта жыжа, дзіцятка маё!"—
Ты сьпяшалася ручкі прыняці.
А цяпер вось каханьня вагню
Аддаеш пачуцьцё ты і сілы,
А заўважыць хто гэта табе—
У вадказ ты сьмяешся так міла...

Алесь Смаленец

### Зраньня ў вакопах.

Выш ня крэсьліць сэмалёт,
Маўчыць шпаркі кулямёт...
Зраньня духата ў зямлянцы,
Иду прайсьціся па дзялянцы.
Бомбакід глядзіць паважна,
Вартаўнік над ім адважна
Пазірае ў тарчы шчэрбу,
Бачыць зломаную вербу,
Два шкілеты паўсдрухнеўшых,
Шмат ракетаў незгарэўшых,
Мінаў, бомбаў... Як іржышча—
Гэта чортава ігрышча.
А з варожага акопа
Выпнуў пэрыскоп высока,
Падазрэнна косіць вока,
Бачыць—вораг недалёка.
Сьпяць жаўнеры ў лісьціх норах,
Можа, сьпіць яшчэ і вораг
І як наш жаўнер, так ён
Нейкі радасны сніць сон..

Янка Пачопка.

### Н О Ч.

Сьпіць сяло. Не адзавецца
Ні душа, ні. Божа брэнь,
Заблішчыць ці скалыхнецца
У вакне якім агонь.
Пуста, глуха, што магіла,
Жыцьця зыку нячуваць,
Сном усіх усё зморыла
І будынкі тыя сьпяць
Я ня сплю, ў вакно крадзецца,
Лезе у хату вужам ноч.
Цяжка, сумна, сэрца б'ецца,
Дзець ня знаеш куды воч.
Гасьне сьвечка. Цьма гусьцеець,
Ў полы чорныя бярэць.
Сэрца стала, ледзянеець,—
Нешта будзе—быццам жджэць.
Вось астатні раз блiснула
Полым сьвечкі на стале.
Полы чорныя згарнула,
Цьма ухухтала мяне.
Я адзін. Сіл нет змагацца,
Клікнуць мне каго, пазваць.
Пуста глуха: ў кожнай хатцы
Ўсе паснулі, мёртва сьпяць.
Труцна, цесна мне ў няволі
Цемра давіць, цісьнець, жмець,
Сілы нет прачнуцца болей,
Цяжка ждаць і так цярпець.
Ждаць, цярпець, пакуль прачнуцца
Ены як стане мой ім чуць....
Мо замоўкнуць?.. Не крануцца?
Анямець і мне? Заснуць?..

Паўлюк Мальва.

### Гора і бяда.

Калі гэту кончыш работу:
То косіш, то жнеш, то гарэш,
То цэпам малоціш да поту
І рэдка калі аддыхнеш.

А там, глядзі, бульба на полі;—
Яе-ж трэба зараз скапаць;
А тут няма дроў, няма солі,—
Адкуль як і гдзе іх дастаць?

Страха на гумне працякае:
Направіць сьпяшы і яе,
Бо дождж, як на зло, ня сьціхае:
Усё ён ліе ды ліе.

І хлеў, як калека бязногі;
Зусім пакрывіўся на бок,
І жджэ маей, бедны, падмогі,
Каб зьдзержыць яго хоць кусок.

Куды ты ні глянь—ўсё работа,
Рабі і рабі без канца,
Там тына няма, няма плота,
То кошык сплясьці—ці дубца.

На ўсё гэта трэба і часу,
Усяго ты ня зробіш зараз:
Калі нап'ешся ты квасу,—
Вада астанецца ў запас.

Бывае, што навет ахоту
К рабоце ты можаш згубіць,
Як гланеш, што ўсю ты работу
Ня кончыш да сьмерці рабіць.

Жылося-ж-бы, можа, й нічога,
Зірнуўшы сюды ды туды,
Каб ў хаце ад Бога ці злога
Ня відзеў ніякай бяды.

А то вот вясной і далося:
Ня знаю, з чаго сьвінчанё,
А посьле і горай прышлося:
Заелі ваўкі каняне.

Дачка пашла замуж нядаўна,
Ды ў шчасьці нядоўга была:
Як вышла там нешта няспраўна,
Ўзяла ды дамоў уцякла.

А жонка з бяды абамлела,
Цяпер і ня есьць і ня сьпіць,
І мусіць саўсім захварэла,
Бо толькі ляжыць ды ляжыць.
Цяпер ты як хочаш вярціся,
А далей дабра не чакай.
Прышло, хоць ваўком абярніся
Ды ў лес ад бяды уцякай.
Відаць, што і гора з бядою
У цесным суседзтве жывуць
І пеўна яны меж сабою
І крэпкую дружбу вядуць.
Бывае, што гора праходзе,
Нігдзе ня відаць і бяды;
Яна-ж, межы тым, блізка ходзе;
І шух!.. быццам човен з вады.
І хочаш—ня хочаш, а трэба,
Як госьцю, яе спатыкаць
І сьлёз ей каўшом замест хлеба
На стол, як вады, наліваць.
Нап'ецца яна колькі хоча,
Яшчэ і у прыпол набярэ,—
Выходзе... глядзіш, а ўжо точа
І гора свой нож на дварэ.

Наталья Арсеньнева.

### Вясельле.

Ці ня вецер над грэбляю вые,
Ці мо' плачуць вярбіны старыя?
Сьмела ночка з тумана тканіны
Працягнула ад лесу да млына...
Месяц белы у хмарах схаваўся,
Зорны шлях пабялеў і парваўся,
Цені густа пакладісь благія
На валу і на пушчы глухія...
Ці-ж ня вецер над грэбляю вые,
Ці мо' плачуць вярбіны старыя?
Не, спраўляе вясельле ля млына
Вадзяны дзед з залёцай дзяўчынай...
Ледзьве йшла маладая: нясьмела,
Тускла поглядам згасшым глядзела,
Вусны сінія сонна сьціскала,
Рукі белыя моўчкі ламала...
На пакатых плячох косы-зьмеі
Рассыпалісь, і кветкі лілей,
Ў іх забіўшысь бялелі халодна
І на грудзі спускалісь выгодна
Ціна стройныя бёдры хавала,
Цела дробна дрыжэла: ўздыхала
Ледзьве йшла маладая, хісталась,
Да рукі жаніха пахілялась...
Горда йшоў малады, усьміхаўся,
Голас грубы ў паветры ірваўся
Сам вялікі, абросшы, гарбаты,
З барадою зялёнай, калматай,
Ракі цэпка ў бароду ўпівалісь,
З сьлізкай цінай зялёнай зьлівалісь...
Цела рыб'ей блішчэла луской
Пахла востра балотам, ракою...
Тускла зьзялі сталёвыя вочы,
Як туман у васеньнія ночы,
Валасы паўсівыя ўздымалісь,
Ветрам буйным трапалісь і рвалісь...
Не сваты маладых запівалі,
— Заручыла іх горкае гора,
Заручыла надоўга і скора...
Не баяркі нявесту ўбіралі,
Яе русу касу расплятаілі...
— Расплятаілі касу срэбны рыбкі,
Расплятаілі умела і шыбка,
Не браточкі уплёты хавалі,—
Акунькі яркі стужкі прыбралі,
Не пяялі вясельныя песьні,
Вецер плакаў пад млынам балесьне,
Не нівесты ўсіх радных дарыла,
Ночь вясельле імглою акрыла,
Не маліліcь зусім маладыя
За іх вербы прасілі густыя...
Іх ня родныя татка і маці
Бласлаўлялі вясельле згуляці,—
Блаславілі іх месяц бяссонны,
Ды бліскучых зор шлях аднатонны,
Не ў царкве маладых павянчалі,—
На дну рэчкі-балота шлюб далі,
Прад налоем ня сьвечачкі зьзялі,—
Над балотам агні прабягалі...
Не аўсом маладых абсыпалі,—
Кроплі дробнага дожджу сплывалі,
Ня гулялі вясельле вясёла,—
Ноч адна уздыхала наўкола—
Ня гудзелі іскрыпкі, цымбалы,—
Вецер плакаўся злосны, нясталы,
Не скакалі хлапцы і дзяўчаты,—
Вадзянік адзін тупаў калматы,
Ен і тупаў, і дзіка сьмяяўся,

# Сыяністская партыя, Дэмакратычная яурэйская партыя, Грамада яурэйскіх купцоў, Грамада

# У Віленскі Сойм не магчыма.

## Пры выбарах ня вер ніякім абяцанкам!
## Пры выбарах ня бойся ніякага прымусу!

цікава адмеціць тое, што гавораць аб нас вялікія пэрыядычныя выданьні, а таксама і аўтары асоб ных палітычна-навуковых кніжак.

---

**В. Станкевичъ** — „Судьбы Народовъ Россіи. — Бѣлоруссія. Украина. Литва. Латвія. Эстонія. Арменія. Грузія. Азейберджанъ. Фінляндія. Польша. — 1921. Издательствво И. П. Ладыжникова. Берлинъ".

Кніга, з боку тэхнічнага, выдадзена вельмі добра, мае 374 страніцы, фармату — 16 (15Х20), і з 8 плянамі ў тэксьце.

Разбор беларускай справы пастаўлены на першае месца.

У ацэнцы беларускага руху аўтар не абыйшоўся бяз некаторых, часам досыць значных, памылак, але гэта можна яму даравацъ, бо пісаў ён сваю кнігу не з беларускай натуры, не з таго, што бачыў, а з малага друкаванага матэр'ялу, што меў пад рукамі за-граніцай з крыніц беларускіх і пад вялікім уплывам агульна расейскай імпэрыялістычнай прэсы.

Дзеля гэтага ня дзіва, што вельмі часта з паважнага і разважнага разгляду падзей, пушчаецца аўтар у крытыку беларускай палітыкі, паўтараючы зады аб немцафільстве Рады Рэспублікі і паланафільстве некаторых беларускіх групкаў.

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, у агульным настрою аўтара і ў паглядах яго на нас чуецца вялікае зьдзіўленьне перад шырынёй той працы, якую зрабіла беларускае грамадзянства ў працягу апошніх некалькіх, — вельмі цяжкіх для нас, — гадоў і мімавольнае, але рашучае прызнаньне таго факту, што —

„Як ні слаба грамадзянственасьць Беларусі — яна дужа ўжо настолькі, што перакуліць усякія пляны на расчляненьне ядзінай па нацыянальнасьці страны".

У гэтым прызнаньні, як ў люстэрку, адбіваюцца пагляды і настроі ўсяго дэмакратычнага грамадзянства Расеі, вочы якога, нарэшце адчыніліся, і яно зразумела і вызнала нашае істнаваньне, моц і нашы справядлівыя дамаганьне.

Ужо разам з намі яно пратэстуе проціў ганебнага падзела Беларусі паміж Бальшавікамі і Польшчай і ўрачыста клянецца, што гэтага акту ніколі ня вызнае расейская дэмакратыя і ўсімі спосабамі будзе змагацца сама і будзе дапамагаць беларусам у растаржэнны і ў дамаганьнях гістарычнай справядлівасьці

Гаворачы аб гістарычнай будучыні Расеі і аб яе магчымых межах, аўтар прызнае—што:

„...расейская мяжа 1914 года ня мае ніякіх пераваг перад праславутай польскай мяжой 1772 году"

„Адбудова Расеі згары — ужо немагчыма. — — Яна можа быць пабудавана толькі зьнізу".

«Не самасьційнасьць дробных народаў, а расейскі нацыяналізм, які нівэліруе і ня лічыцца жыцьцём, ён зьяўляецца цяперака разбураючай сілай.»

І ўжо не „Ядзінай і Недзялімай", пабудаванай «крывёю і зялезам», малюецца яму Расея, а Дэмакратычна-Фэдэральнаю Рэспублікаю, зложанаю з тых частак, Устаноўчыя Соймы якіх гэтага абьяднаньня пажадаюць.

Хто-ж захоча жыць незалежна, дык — хоць і не радзіў бы гэтага аутар, але — жывіце!

Можна было-б, прачытаўшы кніжку В. Станкевіча, падумаць што ён, як і наагул расейская дэмакратыя, пусьціўся на хітрыкі і, бачучы, што вымогамі і пагрозамі справу ўжо не паправіш, узяўся за „пагладжываньні" і „патураньні", каб узяць сваё „ласкай".

Але і тут. з вялікім задаваленьнем, можам мы сьцвердзіць поўнае разуменьне адбытых падзей поўнае прымірэньне з імі: не „акраіны" і несэпаратна настроеныя нацыі вінаваціць ва ўсім аўтар, а саміх расейцаў.

Часта склоны называць гэта „адпадзеньнем" акраін ад Расеі.

Але гэта няпраўда.

Не адпадзеньне часьцей, а распад старой Расеі — вось праўдзівы гістарычны сэнс здарэньняў.

Аджа першым адпаў асяродак, Масква, расьпісаўшыся аб гэтым у Бярэсьці»

„Расея ня зьменшылась, не скрацілась, а наагул перастала быць".

„Яна распалася пад ударамі знадворку, але з прычыны ўнутранае хударлявасьці і слабасьці"

Ккіжка Гр. Станкевіча прымусіць расейцаў яшчэ раз, і вельмі моцна, прызадумацца над сутнасьцю нацыянальных рухаў, як беларусоў гэтак і іншых нацыяў, і дасьць, нарэшце, інтэлігэнцыі досыць паважнае веданьне нацыянальных гісторый тых народаў, што некалі складалі Расейскую Імпэрыю, але ня лічыліся расейцамі за народы.

З разгляду гэтай кніжкі расейская інтэлігэнцыя з задзіўленьнем убачыць, што „акраінныя інародцы" ня толькі ёсьць праўдзівыя народы, але што яны маюць сваю гісторыю, традыцыі культуру і мову, на многа вякоў старэйшыя і часамі ў некалькі разоў мацнейшыя, чым расейскія.

— Гэта, напэўна, умацуе той агульна-згодлівы настрой да самавызначаных нацый, які ўжо выразна наметціўся і ўсё болей і болей расьце ў дэмакратычных расейскіх колах.

Нам, беларусам, варта прачытаць гэту кніжку і яшчэ з аднаго поваду. — Кніга, — малюючы на 374 страніцах гісторыю нацыянальных рухаў 10 розных народаў, адначасна з намі вёўшых сваю барацьбу за сваё нацыянальнае адраджэньне, — дае нам прыклады мэтодаў, срэдстваў і тактыкі гэтае барацьбы, а таксама дае магчымасьць ясна убачыць некаторыя нашыя памылкі, зробленыя ў сваім часе, і знайсьці спосаб пазбавіцца іх у будучыні.

(Канец будзе)

Кастусёнак

---

## Налічэньне на тавар.

„У чужым воку сучок відзіце, а ў сваім бярна ня чуеце"

Ня дужа даўно мы чыталі гутарку аднаго карэспандэнта з дырэктарам скарбу аб тым, што быццам Віленскі Саюз Каапэратываў рабіў у 1920 годзе вялікія налічэньні на тавары. Цікава паглядзець, колькі-ж, блізка што у гэтую самую пару, рабіла налічэньня такая ўрадовая установа, як Дэпартамэнт Апрaвізацыі Літвы Сьродковай.

Паглядзім першыя тры месяцы: Гл. таб. 1

Такім чынам мы відзім, што Дэпартамент Апрaвізацыі ў тую пару налічыў ад 100 проц. да 146 проц. на такія прадукты першай патрэбы, як: жыта (146 і 140 проц.), соль (115, 118 проц.); ад 50 да 100 проц. на прадукты таксама першай патрэбы як: алей (60 проц.), соль (70, 72, 80, 52 і 58 проц.), гарасін (54 проц.), мармэляда (61 проц.), цукер (55 проц.), пры гэтым быў дужа вялікі лік цукру, бо барыш даходзіў да 3.725.881,5 мар.

Саўсім ня хочам вінаваціць Дэпартамэнт Апрaвізацыі за вялікія налічэньні, бо ў часе гвалтоўнага спадку польскай маркі і наогул ненармальнага валютовага становішча, каб ня зьменшыць сваё запраўднае багацьце (ня ў цыфрах грошы, а ў ліку тавараў), трэба па такой цане прадаць тавары, ня гледзячы на вышыню налічэньня, каб купіць ня меней па ліку такога самага тавару. Лічым, аднак, ненармальным вінаваціць і Саюз Каапэратываў у тым, што змушаны рабіць сам Урад Літвы Сьродковай.

Зьвярнуўшыся да Віленскага Саюзу Коопэратываў з запытаньнем аб налічэньнях, мы атрымалі вось якія даныя:

У гэную самую пару (пачатак 1921 г.) прадукты, атрыманыя ад Дэпартамэнту Апрaвізацыі, прадаваліся (барыш брутто): Гл. табл. 2.

Адначасна з дадзенага нам адчоту за 1920 год мы бачым, што Саюз у 1920 г. ўсяго прадаў тавараў на суму 36.230.916, зрабіў налічэньня ў суме 6.032.310, і такім чынам сярэдняе налічэньне ў год складае 16 проц. Зьезд паўнамоцнікаў у 1920 годзе (24—28. IV.) надаў права Управе Саюзу рабіць налічэньне да 18 проц. у сярэднім у год і такім чынам пастанова зьезду ня была нарушана, і зьезд 30. V. 1921. зацьвердзіў адчот Саюзу.

Цікава-б было даведацца, якое-ж налічэньне ў сярэднім у год (1920) зрабіў Дэпартамент Апрaвізацыі? — Ці меншае, як Віленскі Союз Каапэратываў? Павінны тут зазначыць, што лічым няправільным тое, што робяць урaднікі Дэпартамэнту Скарбу, — браць выпадкова які-небудзь адзін тавар і рабіць вывады аб агульнай дзейнасьці арганізацыі, а трэба браць для агульнага вываду і агульныя цыфры ў сярэднім у год. Як ведама, няправільныя вывады ўраднікаў Дэпартамэнту Скарбу далі повад Тымчасовай Урадуючай Камісіі Літвы Сьродковай залічыць Віленскі Саюз Каапэратываў за некаапэратыўную арганізацыю і посьле гэтага, як такую, аблажыць падаткам у 1.120,000 мар!!

Наколькі нам ведама, у Літве Сьродковай ня-

---

Да нявесты зьбялеўшай схіляўся,
А нявеста, — дык рукі ламіла,
Дзіўна-смутна шаптала — прасіла:
„Ня шумі лес, зялёна дуброўка,
Сыпцесь дробныя дождкы густыя,
Уздымайцеся буйныя ветры,
Зялятайце да роднага таткі,
Залятайце да роднай матулі...
Ўставай, уставай, родны татка,
Вынасі абраз. родная маці,
Благаслаўляйце дачушку вясельле,
Ой, дзіўное вясельле гуляці...
Ня шуміць лес, зялёна дуброўка,
Ня ідзець над зямлёй дождж халодны
Ня ўдзымаюцца буйныя ветры,
Не ўстаюць, ня ідуць татка з маткай
Бласлаўляці дачку на вясельле..
Ой, сасонке мая ты густая,
Ой. галоўка мая удалая!
І бяз татачкі нас бласлаўлялі,
І бяз маткі вясельле згулялі...
Была маткаю мне цёмна ночка
Родным таткаю быў ясны месяц,
Выпраўлялі мяне браты — ветры,
Прычыталі на мне сёстры — зоры
Ой. галосна ж званы нам зьвінелі,
Ой, і ярка-ж нам сьвечы гарэлі,
Ой, і пекна ж папы нам сьпявалі
Як у цэркві мы сёньня шлюб брали, —
Толькі я, маладая, паснула;
Ані звонаў. ні сьпеваў ня чула"
Так спраўлялі вясельле ля млына
Вадзяны дзед з заліўцай дзяўчынай
А ім ночка з тумана тканіну
Працягнула ад лесу да млыну —
Месяц белы у хмарах схаваўся,
Зорны шлях пабялеў і парваўся.
Цені густа пакладіліcь благія
На ваду і на пушчы глухія.

## Апостал.

*Адвеку мы спалі, і нас разбудзілі...*

Гарачы камуніста, а даўнейшы прыхільнік беларускага руху таварыш Курапа (партыйная клічка Жабін) з агідаю пакінуў клумнае, пыльнае і галоднае места і паехаў усьведамляць вёску.

Ен заўсёды казаў на мітынгах і на розных зборках, што ня вёска вінавата, а той, хто мала руліцца аб яе усьведамленьні.

— Дык тррэба, таварышы, ехаць на вёску!

Курапа добра ўмеў пабеларуску, вось-жа, як толькі чырвоная армія дала магчымасьць ізноў раз абвесьціць незалежную савецкую Беларусь, ён зараз апынуўся інструктарам аддзела так званага „упраўленія" і дастаў камандзіроўку на правінцыю.

Набраўшы чырвонае літэратуры на ўсіх краёвых мовах, апрача беларускае, бо літэратура ў гэтай мове яшчэ лічылася да той пары контр-рэвалюцыйнай выдумкай беларускіх нацыяналістаў, разьлёгшыся на пахучым, але запыленым сене з дзікай сенажаткі беднага гаспадара, ехаў ён на парцы стайковых коні па Ашмянскім тракце і любаваўся на прыгожую, ціхую, задуманую прыроду беларускага лета.

Каб разьвеяць думкі, камуніста зьвярнуў увагу на свайго вазьніцу.

Той маўкліва кіраваў конямі і часам неяк дзіўна чмыхаў, як-бы нездаволены, але не аглядаўся на свайго простага пана.

— „Якая, аднак, чыста-буржуазная чырта ў спосабе рассаджываньня фурмана і падарожнага, — падумаў з знаёмым асадкам елкасьці таварыш Жабін: — ён, як быццам якое ніжэйшае стварэньне, сядзіць сьпераду, а я, камуніста, быццам які пан, сяджу адзаду"...

— Давайце, таварыш, сядзем побач! — крыкнуў ён фурману, але той, сярод грукату калёсне пачуў і толькі лішні раз, як здалося камуністу, дзіўна, пасвойму чмыхнуў.

Тады Курапа ізноў аддаўся развагам. Спачатку ен троху ўсьцешыўся, што ў яго голаў прыйшла такая важная ідэя — садзіцца на фурманцы побач з фурманам. Але радасьць была нядоўгая. „Гэта-ж я мог сесьці побач яшчэ ў месьце, адразу", — сьцяміў ён.

Нудна.

Ужо месяц, як Курапа кінуў курыць дзеля страшэннай дарагоўлі на табаку і дагэтуль даволі стойка цярпеў і не паддаваўся спакусе, добра знаёмай толькі адным курцом. Аж тут, сярод бязьлюднага, ціхога, задуманага поля, на вялікай пыльнай дарозе, папіроса і дымок ад яе стаялі ўваччу, як здань нязвычайнай прыемнасьці.

— Таварыш, вы курыце? — троху мацней крыкнуў Жабін, каб на гэты раз хурман пачуў яго. Потым паправіўся і паўтарыў ціпэй:

— Вы, таварыш, паліце?

Селянін не пачуў і на гэты раз. Ен ізноў пасвойму чмыхнуў, але назад не павярнуўся.

— Як вашая фамілія? — яшчэ мацней запытаўся ў яго камуніста і, узьняўшыся на руцэ, другою крануў яго за пляччо ў шэрай, густа запыленай сьвітцы.

— Я адзінокі, — адгукнуўся ўрэшце хурман і збоку паказаў сваю даўна няголеную сівую шчаціну і падрэзаны, сіва-жоўты пад носам вус.

— А як прозьвішча?

Хурман памаўчаў, быццам муліўся: казаць ці не, але ізноў павярнуў трохі галаву і пад сьціхаючы грукат возу, адказаў:

— Я пішуся бяз прозьвішча, па бацьку... Янучонак. А людзі празываюцца: Шашок.

— Каталік ці праваслаўны?

— Мы польскія.

І ўзноў чмыхнуў.

Заглядаючы на хурмановыя вусы, Курапа ўпеўніўся, што той займаецца курэньнем. Дык надзівіў, чаму так доўга ён ня курыць, але папрасіць табакі сароміўся і хаця з вялікаю натугаю, а змоўчыў.

— А як пана назьвіска?

Крыху падумаўшы, таксама, камуніста каротка й без асаблівае прыемнасьці назваўся:

— Жабін.. інструктар.

Хурман добра пачуў і весялейшы адгукнуўся:

— Струкар — то, пэўне, імя рускае, бо ў нас гэткіх няма. А пан Жабіньскі быў у нас...

Курапа счырванеў.

— Далоў паноў! Іх трэба біць, як сабак. Правільна, таварыш? — крыкнуў ён над самым вухам хурману і з палёгкаю падумаў: „Ланцуг прыкрасьці трэба рра зьдзірраць адрразу".

— Правільна, — пакорна згодзіўся хурман.

На гэты раз Курапа ня ўцерпіў, дастаў з кішэні каваляк зьмятай паперкі з газэціны, нацёр з лісткоў сена дробнай цыртухі і стаў круціць цыгарку.

Коні неўспадзеўкі смарганулі, і ўсё рассыпалася.

Селянін быццам духам чуў, што той робіць. Аглянуўся, нявідна ўсьміхнуўся пад нос сабе і палез у кішэню, перастаўшы кіраваць коньмі.

— Я дам пану закурыць.

— Будзьце ласкавы, таварыш! Ходь дарма вы зьняважаеце мяне панам. Я такі-ж самы пралетарый, як і вы. І наагул слова „пан" цяпер зусім непатрэбнае.

— Выбачайце: вядома, як мы цёмныя...

Адзін конь меў патрэбу стаць і на нейкі час стануў, і яны круцілі кручонкі з фурмановага кісета. Селянін маўчаў і перастаў чмыхаць.

Калі-ж коні рушылі, а яны з салодкасьцю задымілі, селянін пасеў бліжэй да падарожніка, павярнуўся бокам і ня гледзячы на яго, без асаблівае на від увагі загаманіў сам:

— Нам-бы, таварыш, ксяндза скуль параілі. Ксяндзы з палякамі паўцякалі. Людзі родяцца, уміраюць, а мы ня ведаем, што з імі рабіць.

— „Вось яна справядлівасьць маіх думак і паглядаў на вёску. Места арганізуецца. Людзі таўпесяцца па розных нова-сьпечаных установах. Робяць „работу" — пустую, непрадуктыўную... Пагнаў-бы ўсіх іх, чарцей, на вёску, усьведамляць яе, рэвалюцыянізаваць"...

Так разважаў Курапа, мяркуючы: ці дужа востра ці мякчэй троху сказаць пра ксяндзоў.

— Цяпер можна і без ксяндзоў, таварыш.

Той зьлёгку і з нявыразным змыслам усьміхнуўся, здвярнуўся болей да коні, чмыхнуў па іх. Калі пабеглі трухам, ён дакурываючы сказаў:

— Бяз іх няма як... вядома, людзі родяцца, ўміраюць, што з імі рабіць?

Камуніста з жаласьцю і пагардаю паглядзеў на пахіленае тулава гаспадара і нічога яму пе запярэчыў.

Узьехаўшы на ўзгорак, увідзелі ў лагчыне хаты й хлявы сярод зеляніны дрэў. Селянін уздыхнуў, а Курапа абдумываў, што зараз будзе казаць сабраным людзём.

Вёска не праяўляла ніякіх знакаў жыцьця. Яна, яе драўляныя, нізкія, пад саламянымі стрэхамі будынкі, таксама, як і поле, былі ціха-задуманыя ці навет бяздумныя, маўклівыя, шэрыя.

Пуста й бязьлюдна было на вуліцы. Вось нехта вытыркнуўся з-за рогу пуні на грукат хурманкі і ўзьбіўся, вачыма на яго, чужнога, у чорлым, мястовага. — Боўць! — адным махам зьнік за пуняй і прапаў там бясьсьледна.

Супроць аднэй з лепшых на паглёд хатаў хурманка па загаду Жабіна станула. Камуніста выскачыў і хадзіў ля плоту, каб разьмяць замлелае цела і лепей разгледзіць, што дзеецца ў канцах вуліцы, ці зьбіраюцца людзі. Хурман, зачапіўшы повад за кол у тым-жа плоце, пайшоў на двор — апрaвіцца і папрасіць вядро. Як толькі ён зачыніў за сабою фортку, з хлева высунуўся дзед і маніў яго да сябе рукою. — Шашок! Шашок! — шаптаў дзед, — ідзі сюды, каб на цябе трасца, якога там чорта-камуністага прывёз? — Нех бэндзе пахвалёны... — падаў дзеду руку невясёлы Шашок. — На векі векаў, — адказаў дзед і тойчас прыстаў ізноў з дапытамі: „Ну, ну?" Шашок, схаваўшыся ў пуню, пераказаў усё, што ведаў. — Якісь камітэт хоча рабіць, скончыў — ён — А каб іх паляруш з камітэтамі, — вохаў дзед, — зраквізавалі й майго каня з мальцам у работу. Два тыдні ганяюць, а тут жніво, касавіца. Палякі заганялі... — Папросту гаворыць — усьмяхнуўся Шашок. — Каб не пазналі, падлу, — злаяўся дзед.

Калі хурман выйшаў на вуліцу з вядром, Жабін нездаволена кінуў скрозь зубы:

— Дзе вы столькі прападалі?

— Шукаў, шукаў, няма нікога, усі ў полі.

Як коні былі напоены, Жабін неўспадзеўкі для хурмана скамандаваў: „Вязі на поле!"

Толькі яны завярнулі за гумно, нейкі вер хавы на злом карку кінуўся з-за стогу саломы к лесу. Камуніста інстынктыўна схапіўся за пoхву леваљьвера.

— Хаваюць коні ад „учоту" ў лес, а я вазі ды вазі, — бурчэў невясёлы Шашок.

— Вязі на дарогу, я ім пакажу! — крыкнуў разьзлаваны Жабін, і фурманка завярнулася назад.

Нечыя вочы глядзелі скрозь шчэлку ў гумне, як яна запыліла па дарозе.

1921 г. Максім Гарэцкі.

---

**яурэйскіх рамесьнікау, Партыя Цеірэ-Ціон таксама ня пойдуць на гэтыя выбары**

# Літоускі Камітэт заявіу, што віленскае літоускае грамадзянства ня участвуе у такіх выбарах у Віленскі Сойм.

ма закону, які-бы „нармаваў налічэньне, і дзеля гэтага навет значнае налічэньне з пункту гледжаньня ўлады не падлягае пакараньню, ня ставіцца яно ў віну прыватнаму гандлю, ня можна ставіць у віну і каапэрацыі, як арганізацыям аб'яднаных спажыўцоў, якія самі устанаўліваюць на сваіх сходах і зьездах вялічыню налічэньня. Ніхто ня можа сказаць самім спажыўцам — мы вам забараняем рабіць у вашых каапэратывах тыя ці іншыя налічэньні, бо першае: гэта налічэньне, як перабор, у канцы году варочаецца сябрам, як дывідэнт, а па другое: тады-б — ня маючы магчымасьці свае грамадзянскія зваротныя капіталы тварыць шляхам збору паёў, арганізованыя ў каапэрацыі спажыўцы пазбаўлены-б былі тварыць свае зваротныя капіталы шляхам дабравольнага самаабкладаньня ў відзе большых ці меншых налічэньняў на прададзены з крамы тавар. Ня трэба забывацца, што спажыўцы ў сваіх каапэратывах правяраюць дзейнасьць сваіх выбарных і самі кіруюць гаспадаркай свайго каапэратыва. Здавалася-б, што ураднікам ўмешывацца ў гаспадарчую дзейнасьць каапэрацыі саўсім не выпадае; абойдуцца там і бяз іх. Самі спажыўцы пэўна што лепей абароняць свае ўласныя інтэрэсы, калі-б выбранныя імі ж людзі і зрабілі-б што-небудзь ня так.

ТАБЛІЦА I.

| Назоў. | №№ заказаў. | Дата. | Вага, лік. | Сабе вартасьць. | Прадажная цана. | Налічэньне на адзінку. | %% налічэньня. | Увагі. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| карасін | 67,73 | 30. I. | 226,821 | 208 | 320 | 112 | 54, | |
| соль белая | 117 | 16. II. | 149,30 | 151,2 | 240 | 88.8 | 58, | |
| ,, шэрая | 118,121 | 12,14.II. | 3,509 | 104,5 | 160 | 55,5 | 52, | |
| сыроп | 104 | 16. II. | 34 боч. | 733,6 | 1000 | 266,4 | 36, | |
| селядцы | 90 | 14. II. | 151 боч. | 2898,2 | 4000 | 1101,1 | 40, | |
| жыта | 106 | 16. II. | 563,3 | 485 | 600 | 115 | 24, | |
| ,, ,, | 118,122 і 143 | 18-24. II | 3,853,18 | 249,9 | 600 | 350,1 | 140%! | |
| мармэляда | 119 | 24. II. | 120 | 818,1 | 1320 | 501,9 | 61, | |
| фасоль | 116 | 25. II. | 900 | 13,6 | 20 | 6,4 | 47, | |
| жыта | 152,161 | 24. II. | 80,29 | 484,7 | 600 | 115,3 | 24, | |
| соль мялёная | 142,143,124 | 22. II. | 3683,25 | 88,7 | 160 | 71,3 | 80, | |
| ,, ,, | ,, | ,, | 3641,27 | 87,4 | 120 | 32,6 | 36, | |
| ,, белая | 143 | 23. II. | 2721 | 139,5 | 240 | 100,5 | 72, | |
| жыта | 198 | 1. III. | 101,26 | 424,7 | 600 | 175,3 | 41, | |
| соль мялёная | 160 | 26. II. | 915,80 | 88,6 | 120 | 31,4 | 35, | |
| ,, кавалкамі | ,, | ,, | 915,80 | 86,9 | 120 | 33,1 | 38, | |
| для скаціны | ,, | ,, | 3096,86 | 55,9 | 120 | 64,1 | 115%! | |
| жыта | 165 | 26. II. | 926,25 | 244,5 | 600 | 355,5 | 146%! | |
| соль белая | 183,176 | 2. III. | 2705,15 | 140,6 | 240 | 99,4 | 70, | |
| цукер | 203 | 7. III. | 6105 | 1109,7 | 1720 | 610,3 | 55, | |
| соль кавалк. | 183 | 1 і 3. III. | 5,363,1 | 89 | 120 | 31 | 35, | |
| для скаціны | ,, | ,, | 660,23 | 54,5 | 120 | 65,5 | 118%! | |
| алей | 223 | II. III. | 49,9 | 2213,7 | 3600 | 1386,3 | 60, | |

ТАБЛІЦА II.

| Назоў. | Месяцы. | Плачэна Дэп. Апр. | Прадаваліся коопэратыв. | Налічэньне на пуд. | пр. пр. налічэн. |
|---|---|---|---|---|---|
| карасін | I-IV | 320 | 340 | 20 | 6, |
| соль белая | I-IV | 240 | I-300<br>II-260<br>III-275 | 50<br>20<br>35 | 20,<br>8,<br>14, |
| ,, шэрая | I-IV | 160 | 200 | 40 | 25, *) |
| ,, для скаціны | I-IV | 120 | 160 | 40 | 33, *) |
| ,, чорная | I-IV | 120 | 160 | 40 | 33, *) |
| селядцы | I-IV | 4.000 | 4.500<br>4.300 | 500<br>300 | 12,<br>7, |
| мармэляд | — | 33 | 36 | 3 | 9, |
| Фасоль | — | 800 | 920 | 120 | 15, |
| цукер | I-IV | 1.700 | 1.800<br>1.840 | 80<br>120 | 4,<br>7, |

*) сюды уваходзіць перавозка фурманкамі ад складау Дэп. Апр. да складау Саюзу.

# Апошнія навіны.

## Віленскае Пытаньне ў Лізе Народаў.

ЖЭНЭВА, 23 снежня (А. В.) 10 студня (января) тут адбудзецца 16 сэсыя Рады Лігі Народаў, дзе будзе разгледжана пытаньне аб пратэсту Літвы супроць віленскіх выбараў.

## „ПАДБУХТОРЫВАНЬНЕ“

Адна польская часопісь на беларускай мове прызнае, што выбары ў Сойм „вольныя“, бо „Беларускія Ведамасьці“, прыкладам, цішуць аб іх усё, што хочуць.

Гэта ня праўда! Мы пішам сваю газэту, увесь час аглядаючыся на Лукішскі вастрог.

Асабліва пагоршала для нас справа, калі выйшаў дэкрэт аб тым, што за „падбухторываньне“ супроць гэтых выбараў можна сесьці на год у турму.

Ня страшна беларусам турма, бо яны ўжо да яе прызвычаены, але прыкра для агітацыі няяснасьць справы з „падбухторываньнем“. Што ёсьць „падбухторываньне“ і што — звычайная агітацыя?

Напрыклад, хай нам адкажа памянутая часопісь („Раніца“): можна гаварыць сьмела і адкрыта, каб беларускія сяляне ня прыймалі вучасьця ў выбарах, — ці ня можна?

Будзе гэта „падбухторываньне“ ці звычайная агітацыя пры вольных выбарах?

Дзед Кузьма.

## Беларускі Музыкальна Драматычны Гурток.

Даводзіць да ведама ўсіх беларусаў, што жадаючыя абходзіць сьвяткаваньне сёлетней Куцьці могуць запісывацца ў Гуртку, уносячы складку 1000 м. Вячэра пачнецца а 7 гад.

У сьвяточныя дні Гурток ладзіць:

25 сьнежня—лото, 26 сьнежня—танцавальны ечар, 27 сьнежня—лото, 28 сьнежня—прадстаўлена будзе: „Каралевіч Зыля“, „Я памёр“ і „Па эвізыі“. 29 сьнежня—„На папасе“, „Модны Шляхцюк“ і дывэртысмэнт. 30 сьнежня—Баль-маскарад 31 сьнежня—Спаткаваньне Новага Году. Прадстаўлены будзе: „На папасе“, „Багаты і бедны“, „Новы Год“, Хор безработных, каза, дывэртысмэнт і іншае. 1 студня 1922 г.—лото, 2 студня—прадстаўлена будзе: „Марцэлька“ для вучняў Віленскіх беларускіх школ. 3 студня—лото, 4 студня—прадстаўлена будзе: „Лес шуміць“ і „Боты“. 6 студня—Баль-маскарад.

Новыя дэкарацыі.

Выступаюць усе мастацкія сілы і папоўнены аркестар.

✦ У чацьвер' 29 сьнежня г. г. у памяшканьні Беларускага Музыкальна-Драматычнага Гуртка (Біскупская 12), з прычыны з'езду прадстаўнікоў каапэратываў, будзе даны вучнямі I Віл. Бел. Гімн. СПЭКТАЛЬ-ВЕЧАР. Чытайце афішы!

## Паштовая скрынка.

**Грам. Барану—Горадня.**

Вашу карэспандэнцыю ня здолелі прачытаць. Напішыце яшчэ раз, толькі чарнілам, на лепшай паперы і па магчымасьці разборчыва.

# ХРОНІКА.

*Віншуем нашых чытаньнікаў каталіцкае веры з Калядамі!*

✦ „Бел. Зв.“ паведамляе, што пасьля разгрому беларускіх арганізацый у Горадні, там „нявольна кідаецца ў вочы тая мярцьвечына, якая пануе (дзякуючы варункам) сярод беларускіх кругоў“.

✦ У в. Заскевічах Беніцкае воласьці, Ашмянскага павету, арыштован беларускі вучыцель Язэп Гаўрылік.

✦ У Беніцкай вол. Ашм. пав. агенты Польшчы разьвіваюць шырокую перадвыбарную агітацыю, але ўсьпеху ня маюць.

✦ У в. Засьвір'е Сьвянцянскага пав. сядзіць пад хатнім арыштам ксёндз-беларус Кастусь Стаповіч. Пры рэвізіі ў яго забралі ўсю перапіску.

✦ У пятніцу 23 сьнежня выйшаў чародны нумар (24) тыднёвай часопісі „Беларускі Звон“.

✦ Цяжка захварэў у Вільні і ляжыць у шпіталю сьв. Якуба п. Т. Вярнікоўскі, беларускі працаўнік правага кірунку.

✦ З пачаткам выбарнай агітацыі выйшла ў Вільні новая польская газэта на беларускай мове «Раніца», якая нападае на запраўдныя беларускія арганізацыі, а бароніць зьезд „Краёвай Сувязі“, Аляксюка, выбары ў Сойм і інш. Хто працуе ў гэтай газэце, з яе пакуль што ня відаць. Падпісывае нейкі п. Вацлаў Адамовіч.

✦ З 9-га сьнежня пачалі набіраць рэкрутаў за два гады 1899 і 1900 — як у Горадні, так і ў Горадзеншчыне.

✦ На сросьбу сялян в. Гірычы Слонімскага пав. адчыніць у іх беларускую школу з выкладаньнем польскай мовы, як прадмета, слонімскі школьны інспэктар не дае ніякага адказу.

✦ З Жосьнянскай вол. Дунілавіцкага пав. паведамляюць, што там разьвялося надта многа ваўкоў, якія крадуць скаціну і нападаюць на людзей.

✦ У в. Слабада Жасьнянскай вол., дзе ў адным будынку зьмяшчаецца польская і беларуская школа, польскі вучыцель п. Хылінскі высяліў беларускую вучыцельку грам. Рамаиоўскую з хвораю маткаю ў цесны кухонны куток, а ў вучыцельскіх пакоях у вадным паставіў сваю казу, а ў другім паклаў сена для яе.

УСІХ, ЗНАЮЧЫХ АДРЭС ДАЧКІ
**Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага**
ЛЮБОВІ (цяпер знаходзіцца ў ЗаходняйЭўропе) пільна просім прыслаць яго ў рэдакцыю „Белар. Ведам.“ (Wilno, Ostrobramska 9) або паказаць пэўны спосаб пераслаць ёй пісьмо.

3 студня (января) 1922 г. ў 40-ы дзень сьмерці вуч. Бел. Гімназіі А Бабкінай адбудзецца а 10 г. раніцы у Сьв. Троіцкай царкве панахвіда. Запрашаюцца ўсе вучні гімназіі, а так-сама ўсе тыя, хто ведаў нябожчыцу, каб разам з засмучаньнем пачціць памяць сяброўкі

## Курс на грошы у Вільні.

23 сьнежня.

| | |
|---|---|
| Ням. маркі (1000) | 17 |
| Осты (1000) | 16,90 |
| Фунты | 230 |
| Даляры | 3650 |
| Царскія (10) | 14900 |

## Беларускі паказальнік:

**Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт**-Вострабрамская вул. № 9.
У тым-жа будынку: **Гімназія, Прытулак** і інш. установы
**Віленскі Беларускі Музык.-Драматыч. Гурток**—Біскупская в. № 12-6
**Беларускае Выдавецкае Таварыства** — Вільня, Віленская вул. д. 33, кв. 1 (ад 4-5 гадзіны)
**Беларускі каапэратыў „Райніца“** Вільня, Вялікая Пагулянка, 17.
**Віленскі Саюз Каапэратываў**—Вільня, Малая Пагулянка, 12.
**друкарня „Друк“** — Вільня, Субач, 2
**Рыскі аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“**—Latwija, Riga, Nikołaj ul'a 20 dz. 1.
**Беларускае Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаушчына“ у Латгаліі**—Latwja, Riga, Witebskaja, 16.
**Люцынскі Аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаушчына“ у Латгаліі**—Latwija, Ludze? Sjebežskaja, 66.
**Рада Беларускай Калеіі у Латвіі**—Latwija, Riga, Bulw. Totlebena, 7-3

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

## Зборнік „Беларускіх Ведамасьцей“ № 3.

*Зьмест:* Фантазія; Унія Літоуска-Беларускага гаспадарства з Польшчай 1386-га году — У. Ігнатоускага; З Літэратурнай Хрыстаматыі (Вінцук Дунін-Марцінкевіч—з патрэтам паэта); Вяна, голад, перапала... — верш В. Д.-Марцінкевіча; Голас сіраты з прытулка — верш Прытулковай В.; Абвесткі.

*Цана:* 22 польскіх маркі з перасылкай, для падпісчыкаў „Белар. Ведам.“ — 15 марак з перасылкай.



**Зборнік „Беларускіх Ведамасьцей“ № 2.**

**Зьмест:** Знаманіты сучасны беларускі паэт Я. Купала (з патрэтам); Залаты век беларускага слова (з прыкладам подпісаў беларускіх вяльмож); У лесе — верш Н. Арсеньневай; Жалобны звон — верш П. Мальвы; Гутарка аб кладзе — апавяданьне М. Гарэцкага; Усячына (лічбы сусьветнай вайны) — А. С.; У чысцы—верш Ф. Багушэвіча; У чайцы па вадзе жыцьця — Г. Леучыка (пер. з К. Тэтмаера).

**Цана:** 22 польскіх маркі з перасылкай; для падпісчыкаў „Белар. Ведам.“ — 15 польск. марак.



# Ня вер польскім газэтам на беларускай мове!

# Ня слухай ашуканцаў, працуючых за марачкі польскіх паноў. Лепей зусім не галасаваць, чым галасаваць на сваю бяду!

Рэдактар і Выдавец: Максім Гарэцкі. Друкарня „ДРУК“, Субач 2.